# *ПАМЯЦІ ВУЧОНАГА*

## ІРЫНА ВІКЕНЦЬЕЎНА ШАБЛОЎСКАЯ



*25* сакавіка 2004 года не стала Ірыны Вікенцьеўны Шаблоўскай. Мы страцілі надзвычайнага чалавека. Першы на Беларусі доктар філалагічных навук у галіне замежнай літаратуры, прафесар, больш як дваццаць год загадчык кафедры замежнай літаратуры БДУ, яна з 1969 выкладала на філфаку, рупілася пра рэформу нацыянальнай вышэйшай школы, пры яе непасрэдным удзеле адкрываліся новыя спецыяльнасці па рамана-германскай філалогіі. Кола яе даследчыцкіх інтарэсаў - славянскія літаратуры і вывучэнне беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай. У 1971 годзе Ірына Вікенцьеўна абараніла кандыдацкую дысертацыю «Чэшская літаратура перыяду другой сусветнай вайны», у 1988 - доктарскую «Проза еўрапейскіх сацыялістычных краін 60-х - 70-х гадоў аб другой сусветнай вайне. Агульнае і адметнае». Аўтар манаграфіі «Самай высокай мерай. Сучасная проза еўрапейскіх сацыялістычных краін аб вайне», падручніка «Гісторыя замежнай літаратуры XX стагоддзя. Першая палова», шматлікіх друкаваных прац па гісторыі чэшскай літаратуры, славянскай драматургіі, параўнальнальнаму літаратуразнаўству, артыкулаў па праблемах адукацыі, прадмоваў да твораў Э. Хемінгуэя, О. Уайльда, А. Конан-Дойла, К. Чапека, перакладаў з чэшскай мовы. У апошнія гады жыцця падрыхтавала да выдання манаграфію ў артыкулах «Сусветная літаратура ў беларускай прасторы. Рэцэпцыя, Тыпалогія. Кантакты». З лекцыямі і навуковымі дакладамі І. В. Шаблоўская выступала ў многіх краінах свету, два гады выкладала славістыку ва універсітэце Гранады ў Іспаніі. Яна - аўтар першай на Беларусі праграмы «Гісторыя чэшскай літаратуры» для студэнтаў-славістаў БДУ, Лаўрэат прэмІі года за лепшы крытычны артыкул «Чэшская літаратура: далёкая і блізкая», надрукаваны ў часопісе «Полымя» ў 1997 годзе. Сённяшняя кафедра замежнай літаратуры БДУ, яе прэстыж сярод калег і студэнтаў - гэта ў многіх адносінах плён яе працы. Ірына Вікенцьеўна належала да таго кшталту навукоўцаў, без якіх немагчыма ўявіць айчыннай навукі, без якіх яна не можа існаваць. За яе прастатой, прыроднай сціпласцю хаваўся аналітычны розум, сапраўдная інтэлігентнасць і душэўная тонкасць. Яна мела выключную здольнасць клапаціцца пра ўсіх, хто быў побач. Таленавіты і ўважлівы Настаўнік, пад чыім кіраўніцтвам абаронена не адна кандыдацкая дысертацыя, яна па-мацярынску песціла сваіх вучняў, і яны плацілі ёй любоўю і павагай, якія замянялі ёй званні і ўзнагароды. Яна любіла жыццё і цаніла прыгожае ў любых яго праявах - у словах, гуках вясны, водарах кветак. Да апошняга ўздыху яна заставалася жанчынай, пяшчотнай і надзвычай моцнай.

Яна сышла ціха, да апошняга моманту хаваючы сваю хваробу, не дазваляючы сябе шкадаваць нават самым блізкім людзям. Сышла, пакінуўшы нам светлыя згадкі і сваю любоў. І яна жыве любоўю тых, хто яе ведаў, хто побач жыў ці працаваў, каму пашанцавала быць яе вучнямі.